# Статья в «Настауніцкай газеце» (вып. от 09.12.2022г.)

Статья «На адной хвалі» в «Настауніцкай газеце» выпуск от 9 декабря 2022 года.



Настаўніцкая газета
№ 116 (8756), 9 снежня 2022 года



# На адной хвалі

**Майстар вытворчага навучання — асаблівая фігура ў прафесійнай адукацыі. Гэтая пасада абавязвае не толькі навучаць прафесіі, але і быць арганізатарам пазакласнай, выхаваўчай работы з моладдзю. Сумяшчаць няпроста, але ў майстра Магілёўскага прафесійнага электратэхнічнага каледжа Пятра Сібарава атрымліваецца.**

Працоўны стаж Пятра Віктаравіча — усяго 2 гады. Але ён ужо дасягнуў нямала значных поспехаў: неаднаразова станавіўся прызёрам рэспубліканскага і еўразійскага чэмпіянатаў WorldSkills, іншых конкурсаў прафесійнага майстэрства. Малады майстар упэўнены: гэта вынік таго, што ў свой час ён зрабіў правільны выбар.

— Пасля заканчэння 9 класаў быў у пэўнай разгубленасці. Выразнай прафесійнай дарогі для сябе не бачыў. Варыянтаў, куды пайсці вучыцца, было шмат. Бацькі параілі электратэхнічны каледж, бо электраманцёр — прэстыжная і запатрабаваная спецыяльнасць. Я прыслухаўся да іх, паступіў і аб тым рашэнні ніколі не шкадаваў. Тут я сапраўды знайшоў сваё месца ў жыцці, — падзяліўся Пётр Сібараў.

Па яго словах, вучоба давалася лёгка, бо заняткі былі займальнымі і цікавымі. Да таго ж педагогі ў каледжы — прафесіяналы сваёй справы.

— І зараз я вельмі ўдзячны Аляксандру Сяргеевічу Ваўчкову і Андрэю Анатольевічу Аніськову. Яны заўважылі мой патэнцыял, змаглі скіраваць мае здольнасці ў правільнае рэчышча. Мы ўжо калегі, але яны і зараз для мяне — прыклад для пераймання, — паведаміў Пётр Віктаравіч.

Дарэчы, стаць майстрам ён вырашыў па гэтай жа прычыне — натхніўся адданасцю працы сваіх выкладчыкаў. Калі ад кіраўніцтва каледжа паступіла прапанова паспрабаваць сябе ў педагагічнай дзейнасці — згадзіўся не разважаючы.

— Я тады набываў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Кваліфікацый было некалькі. Адна з іх — якраз майстар вытворчага навучання. Падчас выступленняў на конкурсах назапасіў шмат ведаў, і ўжо ўзнікалі думкі аб тым, што хацелася б перадаваць свой вопыт моладзі. Канечне, спачатку адчуваў хваляванне. Першыя свае заняткі праводзіў, выпускаючыся з каледжа. Перажываў, ці змагу наладзіць кантакт з вучнямі і заваяваць у іх аўтарытэт, наколькі вынікова буду весці заняткі, — расказаў Пётр Сібараў.

У прафесійным станаўленні Пятра Віктаравіча вельмі падтрымалі старэйшыя калегі. І ўсё, да чаго імкнуўся, у яго атрымалася. З навучэнцамі ў маладога майстра выбудаваны даверлівыя ўзаемаадносіны.

— Стараюся быць на адной хвалі з вучнямі. Станоўчая атмасфера ў групе шмат у чым уплывае на якасць навучання, таму да кожнага з навучэнцаў шукаю свой падыход. Усе яны розныя, але я ніколі не падзяляю дзяцей на таленавітых і неталенавітых. Пэўныя здольнасці ёсць у кожнага, і мая задача — разгледзець і дапамагчы іх раскрыць, — сказаў Пётр Сібараў.

Сваёй галоўнай мэтай Пётр Віктаравіч лічыць прафесійную падрыхтоўку. Менавіта на гэта ён робіць упор. Штодня старанна вучыць падлеткаў працаваць рукамі, сумленна выконваць работу, каб у далейшым яны атрымлівалі ад выбранай прафесіі не толькі матэрыяльнае, але і маральнае задавальненне. А яшчэ імкнецца да таго, каб прывіць навучэнцам пачуццё адказнасці за сваю працу. Зыходзячы з гэтага, будуе свае заняткі.

— Мне неабходна сфарміраваць у вучняў прафесійныя навыкі на аснове тых ведаў, якія яны атрымліваюць у працэсе тэарэтычнага навучання. Заўсёды вызначаю прамежкавыя крокі і вынікі кожных заняткаў, дакладна ўяўляю, якія ўменні мае вучні павінны набыць па іх заканчэнні, — адзначыў Пётр Сібараў.

Не забываецца Пётр Віктаравіч і пра выхаванне моладзі. Па яго меркаванні, у дарослае жыццё навучэнцаў трэба выпускаць не толькі кваліфікаванымі спецыялістамі, але і дастойнымі людзьмі. Малады майстар часта сустракаецца з выхаванцамі ў пазаўрочны час. Разам яны наведваюць выхаваўчыя мерапрыемствы ў каледжы, гутараць аб важным, ствараюць незвычайныя рэчы для ўдзелу ў конкурсах тэхнічнай творчасці.

> ***Стараюся быць на адной хвалі з вучнямі. Станоўчая атмасфера ў групе шмат у чым уплывае на якасць навучання, таму да кожнага з навучэнцаў шукаю свой падыход.***

Прычым удзельнічаюць даволі вынікова: неаднойчы выходзілі ў прызёры на абласным, былі пераможцамі на рэспубліканскім узроўні.

Пётр Сібараў прытрымліваецца думкі, што, навучаючы, трэба вучыцца самому. Ён пастаянна займаецца самаадукацыяй, вывучае новыя прагрэсіўныя і дзейсныя формы навучання.

— Праходжу курсы павышэння кваліфікацыі, спрабую сябе ў конкурсах. Сёлета заваяваў сярэбраны медаль Еўразійскага чэмпіянату "Маладыя прафесіяналы". Спаборніцтвы даюць новы вопыт і веды, якія потым прымяняю на сваіх занятках. Перакананы, што вучыць неабходна згодна з сучаснымі рэаліямі, улічваючы змяненні на вытворчасці і іншыя новаўвядзенні. Толькі так магчыма рыхтаваць запатрабаваных рабочых і спецыялістаў, — лічыць Пётр Віктаравіч.

Гэты неардынарны майстар неаднаразова ўзнагароджваўся. Акрамя шматлікіх перамог на міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах, у скарбонцы яго працоўных дасягненняў — дыплом лаўрэата спецыяльнай прэміі аблвыканкама. У Пятра Сібарава шмат планаў на будучыню, але ўсе іх аб'ядноўвае адно — жаданне застацца і працягваць удасканальвацца ў любімай прафесіі.

**Ганна СІНЬКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**